УДК 947.6.«1917»

**І. М. Рыжанкоў**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# АГРАРНЫ РУХ У БЕЛАРУСІ Ў ПЕРСПЕКТЫВЕ ВЫРАШЭННЯ ЗЯМЕЛЬНАГА ПЫТАННЯ (верасень – кастрычнік 1917 г.)

У артыкуле асвятляецца аграрны рух у беларускіх губернях на этапе абвастрэння рэвалюцыйных падзей, якія ахапілі Расію восенню 1917 г. Аўтар адзначае, што з верасня па кастрычнік павялічваецца колькасць сялянскіх выступленняў. Шэраг зямельных, харчовых і нават урадавыя (валасныя) камітэты спрыялі сялянам у паляпшэнні іх маёмаснага стану за кошт памешчыцкай і казённай уласнасці. Канфлікты, якія ўзнікалі ў выніку іх дзейнасці паміж зацікаўленымі бакамі, як правіла, завяршаліся на карысць мясцовых сялянскіх грамадстваў. У параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расіі, сялян беларускіх губерняў задавальняў легальны, паўлегальны і часам стыхійны характар руху супраць уласнікаў, памешчыкаў, арандатараў у барацьбе за паляпшэнне свайго маёмаснага стану. Пагромны рух на Беларусі не набыў дастатковай моцы і самае галоўнае не займеў антыўрадавы характар. Крымінальныя выступленні з рабаваннем ініцыяваліся, як правіла, дэзерцірамі і дадзеныя факты падлягалі расследаванню. Сяляне не лічылі пагромы маёнткаў асноўным сродкам вырашэння сваіх гаспадарчых патрэб. Невыпадкова ўсе яны прынялі актыўны ўдзел у выбарах дэпутатаў Устаноўчага сходу, спадзеючыся на вырашэнне аграрнага пытання законным, а не гвалтоўным шляхам.

**Ключавыя словы:** рэвалюцыя, захоп зямлі, аграрнае пытанне.

**Для цытавання:** Рыжанкоў І. М. Аграрны рух у Беларусі ў перспектыве вырашэння зямельнага пытання (верасень – кастрычнік 1917 г.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2021. № 1 (245). С. 42–46.

**I. M. Ryzhankou**
Belarusian State Technological University

# AGRARIAN MOVEMENT IN BELARUS IN THE FUTURE SOLVING THE LAND ISSUE (september – october 1917)

The article highlights the agrarian movement in the Belarusian provinces at the stage of aggravation of the revolutionary events that swept Russia in the autumn of 1917. The author notes that from September to October, the number of peasant demonstrations increases. A number of land, food, and even government – volost committees helped the peasants to improve their property status at the expense of landlords and state property. The conflicts that arose as a result of their activities between the interested parties, as a rule, ended in favor of the local peasant societies. In comparison with other regions of Russia, the peasants of the Belarusian provinces were satisfied with the legal, semi-legal and sometimes spontaneous nature of the movement Against owners, landlords, tenants in the struggle for improving their property condition. The pogrom movement in Belarus has not acquired sufficient strength and, most importantly, has not acquired an anti-violent character. Criminal acts of robbery were usually initiated by deserters and these facts were subject to investigation. The peasants did not consider the pogroms of the estates as the main means of solving their economic needs. It is no coincidence that all of them took an active part in the election of deputies to the Constituent Assembly, hoping for a solution to the agrarian issue legally, and not by force.

**Key words:** revolution, the seizure of land, the agrarian question.

**For citation:** Ryzhankou I. M. Agrarian movement in Belarus in the future solving the land issue (september – october 1917). *Proceeding of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2021, no. 1 (245), pp. 42–46 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Летам 1917 г. сярод аграрных парушэнняў значную частку займала дзейнасць зямельных камітэтаў на задавальненні за кошт памешчыцкай і казённай уласнасці патрэб вясковага (абшчыннага) сялянства ў сенакосах, пашы, лесе і паліве [1]. Канфлікты, якія ўзнікалі ў выніку іх працы паміж зацікаўленымі бакамі, як правіла, завяршаліся на карысць мясцовых сялянскіх грамадстваў. Як вынікае з ліста А. С. Паснікава на адрас Часовага ўрада ад 23 жніўня, захопны рух сялянства ў найбольшай ступені выявіў сябе не на Беларусі, а ў

Пензенскай, Казанскай і Курскай губернях. У параўнанні з ліпенем, колькасць паветаў Расіі, ахопленых аграрнымі хваляваннямі, скарацілася на 11,4% [2, с. 7].

**Асноўная частка.** З пачаткам восені, калі збор ураджаю і нарыхтоўка фуражу сталі надыходзіць у завяршальную стадыю, калі пры неабходнасці правядзення пасеву азімых у земляробаў не дадалося ўпэўненасці адносна Устаноўчага сходу і лёсу аграрнага пытання, калі стала ўзрастаць патрэба ў паліве на зіму і г. д., гаспадарчая актыўнасць вясковага насельніцтва, у тым ліку яе захопныя праявы, набылі далейшае развіццё і новыя асаблівасці. Да гэтага варта дадаць, што распрацаванае адмысловай камісіяй Галоўнага зямельнага камітэта «Палажэнне аб ліквідацыі прыватнага землеўладання» ператварала заможныя сялянскія гаспадаркі, у тым ліку хутары, у аб'ект захопніцкіх інтарэсаў вяскоўцаў-абшчыннікаў.

Да гэтага часу на Беларусі (акрамя Віленскай губ.) дзейнічалі 544 зямельныя камітэты. Найбольшая іх колькасць – 202 – існавала ў Мінскай губ. Па прычыне эвакуацыі ў Ніжні Ноўгарад мясцовага ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцей усе казённыя лясы і землі Барысаўскага павета перайшлі ў веданне зямельных камітэтаў [3]. Невыпадкова, на яго тэрыторыі выявіла сябе бескантрольная сялянская актыўнасць, скіраваная на выкарыстанне панскай, казённай або чужой абшчыннай маёмасці. Былі выпадкі, калі ў пагоні за чужым дабром сяляне нават пакідалі свае палі няўбранымі. У прыватнасці, у тэлеграме на імя Часовага ўрада ад групы лесапрамыславікоў паведамлялася, што сяляне Барысаўскага павета пад уздзеяннем «дэзерціраў і камітэтаў увозілі хлеб, сена і лес». Пачасціліся парубкі лесу ў Рэчыцкім, Навагрудскім і Слуцкім паветах.

З цягам часу актывізавалася разбуральная дзейнасць зямельных камітэтаў Віленшчыны. Так, сяляне вёсак Струкава і Каляч Вілейскага павета «адабралі сенакосы, сякуць і раскрадаюць лес у маёнтку Анкудава. У Дзісненскім павеце сяляне пад уплывам мясцовых камітэтаў адмовіліся плаціць гаспадару маёнтка Дрыгучы Каржанеўскаму за арэнду зямлі. 9 верасня ў Люцынскім павеце Звірздзінскі валасны зямельны камітэт дазволіў сялянам пасвіць жывёлу ў прыватнаўласніцкіх лясах, на палях і лугах. А сяляне вёскі, размешчанай паблізу маёнтка Астроўшчына Лепельскага павета, па ўласнай ініцыятыве пастанавілі «секчы лес як для ўласных патрэб, так і на продаж у горад», а грошы (па 2–3 руб. за сажань бярозавых дроў) уносіць у сельскі камітэт.

Як адзначала газета «Народнае слова» ад 3 верасня 1917 г., на Магілёўшчыне новая хваля аграрнага руху пачыналася лакальна, «на глебе патраў і захопаў». Так, жыхары вёскі Усушка Быхаўскага павета «гвалтоўна захапілі яравы ўраджай эканоміі Зарэсце, якая належала пану Вішнеўскаму. У Гомельскім павеце 14 верасня сяляне ў адпаведнасці з пастановамі сваіх камітэтаў падзялілі азімыя пасевы ў фальварку Антонаўка, які належаў І. Брытаву. «Народнае слова» ад 20 верасня паведамляла, што ў Сенненскім павеце «падвергся разгрому» маёнтак Дэканы пана Бялкоўскага. Акрамя таго, менавіта ў Сенненскім павеце было па-драпежніцку вынішчана шмат лясоў. І наогул да канца верасня самавольна распачатыя парубкі прыватных і іншых лясоў набылі стыхійны характар. У Гомельскім павеце сяляне мястэчка Уваравічы «збіралі па некалькі соцень падвод, здзяйснялі суцэльную парубку леса» і, што характэрна, насуперак мясцоваму зямельнаму камітэту.

Трэба адзначыць узрастанне колькасці паведамленняў аб няздольнасці ўрадавых органаў прыпыніць захопны рух у Мінскай губерні. Тых, хто пярэчыў гвалту, члены камітэтаў пагражалі арыштаваць. У той самы час аграрныя беспарадкі ў Аршанскім павеце яшчэ не ўяўлялі для Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў асобых хваляванняў і таму 28 верасня на пасяджэнні выканкама было вырашана адхіліць прапанову аб выкарыстанні вайскоўцаў і арганізаваць агітацыйныя паездкі па павеце. Характэрна і тое, што і самі вайскоўцы не ўяўлялі сабою прыклад для паводзін. Паводле звестак Ваеннага міністэрства, у верасні салдаты дзвюх (Мінскай і Дзвінскай) з чатырох прыфрантавых акруг бралі ўдзел «у аграрных беспарадках» [4, с. 234].

7 кастрычніка люцынскі камісар паведамляў, што дзейнасць міліцыі абмяжоўваецца толькі складаннем пратаколаў і адсылкай іх адпаведным установам. На старонках газеты «День» ад 8 кастрычніка адзначалася, што на Случчыне «насельніцтва варожа сустракае казачыя раз'езды. Міліцыя пакідае службу...».

Першай небяспекай для дзяржавы Часовы ўрад лічыў пагрозу голаду ў арміі і горадзе. Так, «Могилевская жизнь» ад 24 верасня паведамляе, што Міністэрства земляробства прадпісала губернскім і павятовым зямельным камітэтам прыняць захады, «каб валасныя камітэты не перашкаджалі збору хлябоў». Разам з тым рабіліся адпаведныя ўладныя намаганні і для таго, каб паскорыць працэс падрыхтоўкі да аграрнай рэформы. У гэтым сэнсе праца зямельных камітэтаў па збіранні падрабязных і дакладных матэрыялаў аб пасяўных плошчах і г. д. не вызначалася асаблівымі поспехамі.

Рэальнымі з пункту гледжання ўладных структур задачамі зямельных камітэтаў з'яўляліся

прадухіленне вяскоўцаў ад неарганізаванай дзейнасці ў адносінах да памешчыцкай, казённай і іншай маёмасці; фармаванне ў іх устойлівага пераканання ў шкоднасці захопнага руху, упэўненасці ў абавязковай рэалізацыі аграрнай рэформы Устаноўчым сходам.

Між тым у саміх членаў зямельных камітэтаў, а таксама іх арганізатараў і ідэйных натхніцеляў склаліся ўласныя перакананні адносна функцый, задач і ролі ў грамадскім жыцці. Варта адзначыць, што ўжо ў з пачаткам восені асноўная маса партыйных арганізацый левай і левацэнтрысцкай арыентацыі Беларусі выказвалася за заканадаўчую перадачу ўсёй зямлі зямельным камітэтам да склікання Устаноўчага сходу. Нават пасля адстаўкі «сялянскага міністра» Чарнова палітыка Часовага ўрада з большасцю міністраў-сацыялістаў у дачыненні аграрнага пытання працягвала заставацца спрыяльнай для сялянства. Дзяржава пазбягала выкарыстання сілавых сродкаў у падаўленні захопнага руху.

Невыпадкова адміністрацыя, харчовыя і зямельныя камітэты, Саветы рабочых, салдацкіх, сялянскіх дэпутатаў, іншыя арганізацыі прыкладалі намаганні для прадухілення стыхійных выступленняў на вёсцы: ладзілі асветніцка-тлумачальныя гутаркі, сходы ў сялянскіх грамадствах – аб шкоднасці самавольнай рубкі лясоў, асабліва прызначаных для абароны краіны. Улады спрыялі пошуку ўзаемапаразумення паміж вяскоўцамі з аднаго боку, і ўласнікамі, арандатарамі, лесапрамыслаўвікамі, ваеннымі і земскімі нарыхтоўчымі службамі – з другога. Але станоўчых вынікаў удавалася дасягнуць далёка не паўсюдна.

Па меры завяршэння восеньскіх сельскагаспадарчых работ узрастала ўвага насельніцтва да праблемы нарыхтоўкі паліва. У шэрагу месцаў працягваліся парубкі лесу санкцыянаваныя камітэтамі. «Народное слово» ад 3 кастрычніка паведамляла, што ў маёнтку Альшанікі Полацкага павета сяляне па распараджэнні мясцовых выканаўчых камітэтаў секлі памешчыцкія лясы. 7 кастрычніка люцынскі камісар паведамляў губернскаму, што ўзмоцненае высяканне прыватнаўласніцкіх лясоў назіралася ў 20 маёнтках [5]. Масавыя парубкі лесу адзначаліся таксама ў Лепельскім Невельскім, Дрысенскім паветах.

Да гэтага часу ў шэрагу месцаў Беларусі зямельнымі камітэтамі былі выпрацаваны нормы водпуску дроў. Карэспандэнт газеты «Могилевская жизнь» В-віч І. 27 кастрычніка паведамляў: у кастрычніку для сялян Чэрыкаўскага павета гэта каштавала ад 2 да 12 руб. за кубічны сажань. Не пазней 8 кастрычніка Віцебскі губернскі зямельны камітэт распрацаваў нормы продажу лесу гаспадаркам: «на адну печ...1 саж. дроў і 1 саж. хворасту са змешанага лесу і 1 куб. саж. дроў на надзел зямлі ў 20 дзес. для сушкі хлеба» [6]. Мінскі губернскі зямельны камітэт сумесна з саюзам лесаводаў і прадстаўнікамі лесапрамыслаўвікоў распрацавалі «ў выглядзе таксы» часовыя цэны на нарыхтоўку дроў у прыватнаўласніцкіх лясах. У адпаведнасці з імі, Астрашыцка-Гарадоцкі зямельны камітэт стаў выдаваць сялянам запіскі на нарыхтоўку 2 сажаняў дроў [7, с. 793]. Але ў іншых мясцінах, як паведамляла газета, «землеўладальнікі не падпарадкаваліся гэтай пастанове і тым узмацняюць узбуджэнне сялян» [8].

Невыпадкова слуцкі камісар тэлеграфаваў у Мінск аб «самачынных суцэльных парубках лясоў». У шэрагу месцаў самі ж сяляне не прытрымліваліся заключанай з памешчыкам дамовы. Так, уладальнікі маёнтка Церабоўша, Гомельскага павета па патрабаванні валасных камітэтаў адвялі ўчастак лесу для задавальнення сялян «таннымі дрывамі», але так і не ўратавалі астатнія лясныя ўгоддзі ад іх (вяскоўцаў) «масавай драпежніцкай парубкі» і таму мусілі падаць скаргу на адрас Часовага ўрада [9].

Такім чынам, у ліку асноўных прычын, якія выклікалі процізаконныя парубкі, заставалася нявырашанасць аграрнага пытання, неўпарадкаванасць функцый рознага кшталту камітэтаў і іх узаемаадносін з землеўладальнікамі. Наступленне халадоў і ўзрастанне попыту на паліва абвастралі і без таго складанае становішча ў краіне. Пэўную дапамогу ў вырашэнні гэтай праблемы мусілі аказаць «Правілы аб ахове лясоў і іх рубкі» ад 10 кастрычніка, паводле якіх толькі на зямельныя камітэты ўскладаліся функцыі забеспячэння насельніцтва палівам і лесаматэрыяламі, аховы лясоў ад раскрадання і іх драпежніцкай эксплуатацыі ўладальнікамі.

Але карэнных станоўчых змен не адбылося. Мала таго, забеспячэнне вяскоўцаў дрывамі ажыццяўлялася з выкарыстаннем як казённых, так і прыватнаўласніцкіх, у тым ліку сялянскіх уладанняў. Пры гэтым, як адзначалася 15 кастрычніка на нарадзе па барацьбе з анархіяй пры Гомельскім павятовым камісарыяце, сяляне секлі лес ў мэтах продажу на высокіх цэнах.

Другая акалічнасць заключалася ў тым, што сяляне асобных вёсак і грамадстваў з дапамогай зямельных камітэтаў імкнуліся прадухіліць лесанарыхтоўкі ў тых маёнтках, якія павінны былі перайсці да іх. У шэрагу выпадкаў прычынай сутыкненняў з'яўлялася агітацыя салдат-адпускнікоў «аб меўшай адбыцца дзяльбе паміж сялянамі ўсіх зямель і лясоў» [10]. Так, у верасні ў Жыцінскай воласці Бабруйскага павета адбыўся канфлікт з пагрозай самасуду з-за памешчыцкага лесу, на які прэтэндавалі жыха-

ры сяла Крынкі і навакольных вёсак. У кастрычніку сяляне пяці вёсак Коханаўскай воласці Аршанскага павета склалі пратэст і вымусілі валасны зямельны камітэт забараніць валку лесу ў маёнтку Лосі. А затым «трыста часткова ўзброенных сялян» прагналі рабочых-кітайцаў з лесасекі [11].

У сваіх дзеяннях вяскоўцы з варожасцю ставіліся не толькі да «іншародцаў», а і да сялян, якія не ўваходзілі ў іх грамадства. У прыватнасці, 23 кастрычніка атраду казакоў ледзь удалося прыпыніць сутыкненне сялян Трасцянца з жыхарамі Шабаноў і Абчака за лес памешчыцы Юрловай. Прычым кожны з названых бакоў быў упэўнены ў сваіх правах на яго. У выніку сутыкнення 4 сялян было забіта і шмат паранена.

**Заключэнне.** Такім чынам, нявырашанасць аграрнага пытання ў краіне і зацягванне выбараў ва Устаноўчы сход з’яўлялася адной з вызначальных падстаў для крытыкі кабінета Керанскага. Восенню 1917 г. аграрны рух не набыў палітычны змест адпаведна супраць Часовага ўрада [2, с. 10]. Палітычных выступленняў з патрабаваннямі адстаўкі ўрада або паскоранай змены існуючага дзяржаўнага ладу не вядома. Сялян задавальняў легальны, паўлегальны і стыхійны характар руху супраць уласнікаў, памешчыкаў, арандатараў у барацьбе за паляпшэнне свайго маёмаснага стану. Крымінальныя выступленні з рабаваннем або забойствамі арганізоўваліся, як правіла, дэзерцірамі і дадзеныя факты падлягалі расследаванню.

Адным з першых вынікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі з’явілася выданне Дэкрэту аб зямлі. Варта адзначыць, што спецыяльнага абвяшчэння сялян аб перамене ўлады, як у сакавіку – красавіку, не адбывалася. Асобныя ўрывачныя звесткі аб скасаванні памешчыцкага землеўладання ў лепшым выпадку не паспрыялі ні ўтаймаванню аграрнага руху, ні падрыхтоўцы да зямельнай рэформы.

Старыя органы ўлады былі скасаваны, а новыя знаходзіліся ў стадыі фармавання і не здольныя былі перапыніць ўзнікшыя пагромы. Значную (калі не вызначальную) ролю ў тым адыгрывалі салдаты, пазбаўленыя цэнтралізаванага харчовага забеспячэння. Паводле звестак гарадоцкага земскага дзеяча Карпава У. М., «салдаты зараз наводзяць паніку і на сялянскія масы» [12]. Натуральна, што ў мясцовасцях, пазбаўленых прысутнасці вайсковых часцей, рабаўніцтва сялян не насіла суцэльна знішчальнага характару. Мала таго, каб пазбегнуць магчымага пакарання, вяскоўцы рабавалі панскую маёмасць «скопам», гэта значыць усёй грамадой, ускладаючы штраф на тых, хто не хацеў у тым удзельнічаць [7, с. 14].

У лістападзе «пагромны рух» назіраўся ва ўсіх частках Беларусі, асабліва ў Барысаўскім, Быхаўскім, Віцебскім, Гарадоцкім, Дрысенскім, Ігуменскім, Чэрыкаўскім і іншых паветах. Так, у Ракаўскай воласці былі разрабаваны ўсе маёнткі, у Гарадоцкім павеце ацалелі толькі 2. Характэрна, што захопныя дзеянні сялян былі скіраваны не на зямельную або лясную ўласнасць памешчыкаў, а на прадукты, жывёлу і інвентар.

Важна адзначыць тую акалічнасць, што сяляне не лічылі пагромы маёнткаў асноўным сродкам вырашэння сваіх гаспадарчых патрэб. Невыпадкова ўсе яны прынялі актыўны ўдзел у выбарах дэпутатаў Устаноўчага сходу, спадзеючыся на вырашэнне аграрнага пытання законным, а не гвалтоўным шляхам.

## Спіс літаратуры

1. Рыжанкоў І. М. Аграрны рух у Беларусі ў перспектыве вырашэння зямельнага пытання (чэрвень – жнівень 1917 г.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2020. № 1 (233). С. 27–31.
2. Крестьянское движение в 1917 г. / под ред.: М. Н. Покровского, Я. А. Яковлева. М. – Л.: Госиздат, 1927. 442 с.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (НГАРБ). Ф. 1534. Воп. 1. Спр. 2. Л. 185.
4. Андреев А. М. Солдатские массы гарнизонов русской армии в Октябрьской революции. М.: Наука, 1975. 343 с.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 60. Воп. 4. Спр. 188. Л. 295.
6. Местная хроника. О порубках // Витебское слово. 1917. 8 окт. С. 3.
7. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы: В 2-х т. Белоруссия в период подготовки социалистической революции (февраль – октябрь 1917 г.) / редкол.: Г. С. Горбунов, Ф. А. Новиков, М. С. Кравченко [и др.]. Минск: Госиздат БССР, 1957. Т. 1. 1008 с.
8. Провинциальная хроника // Народное слово. 1917. 5 окт. С. 4.
9. Дзяржаўны архіў Расійскай федэрацыі (ДАРФ). Ф. 1779. Воп. 1. Спр. 296. Л. 76
10. Местная жизнь. Эксцессы в Могилевском уезде // Могилевская жизнь. 1917. 25 окт. С. 3–4.
11. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 243. Л. 421.
12. НАРБ. Ф. 628. Воп. 1. Спр. 3. Л. 62.

## References

1. Ryzhankou I. M. Agrarian movement in Belarus in the perspective of solving the land issue (September – October 1917). *Trudy BGTU* [Proceeding of BGTU], issue 6, History, Philosophy, 2020, no. 1 (233), pp. 27–31 (In Belarusian).

2. Pokrovsky M. N., Yakovlev Ya. A. *Krest'yanskoye dvizheniye* [Peasant movement in 1917]. Moscow; Leningrad, Gosizdat Publ., 1927. 442 p.

3. National historic archive of Belarus (NHARB). Fund 1534. I. 1. F. 1. P. 185.

4. Andreev A. M. *Soldatskiye massy garnizonov russkoy armii v Oktyabr'skoy revolyutsii* [The mass of soldiers of the garrisons of the Russian army in the October Revolution]. Moscow, Nauka Publ., 1975. P. 234.

5. National Archives of the Republic of Belarus (NARB). Fund 60. I. 4. F. 188. P. 295

6. Local chronicle. About felling. *Vitebskoye slovo* [Vitebsk word]. 1917. October 8. P. 3 (In Russian).

7. Gorbunov G. S., Novikov F. A., Kravchenko M. S. *Velikaya Oktyabr'skaya sotsialisticheskaya revolyutsiya v Belorussii. Dokumenty i materialy. Belorussiya v period podgotovki sotsialisticheskoy revolyutsii (fevral' – oktyabr' 1917 g.)* [The Great October Socialist Revolution in Belarus. Documents and materials: In 2 volumes. Belarus in the period of preparation for the socialist revolution (February – October 1917)]. Minsk, Gosizdat BSSR Publ., 1957, vol. 1. 1008 p.

8. Provincial chronicle. *Narodnoye slovo* [Popular word]. 1917. October 5. P. 4 (In Russian).

9. State archive of the Russian Federation (SARF). Fund 1779. I. 1. F. 296. P. 76.

10. Local life. Excesses in the Mogilev district. *Mogilevskaya zhizn'* [Mogilev life]. 1917. October 25. P. 3–4 (In Russian).

11. NARB. Fund 60. I. 3. F. 242.

12. NARB. Fund 628. I. 1. F. 3. P. 62.

## Інфармацыя пра аўтара

**Рыжанкоў Ігар Міхайлавіч** − кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: im@belstu.by

## Information about the author

**Ryzhankou Ihar Mikhaylavich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: im@belstu.by

*Пастуніў 23.03.2021*